БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 14 (96)
май
2009 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.

Кахання і згоды !

с.3

Сям'я

с.4

Радня

с.5

З Юбілеем!

22 мая
Зіна Стэфанаўна
СЯРГЕЕНКА
адзначае 75-годдзе

22 мая
Мікалай Яўсеевіч
ЧУМАКОЎ
адзначае 70-годдзе

8 мая
Мікалай Сяргеевіч
УХАНАЎ
адзначае 65-годдзе

13 мая
Генадзь Пятровіч
СМАЛЯКОЎ
адзначае 60-годдзе

22 мая
Мікалай Адамавіч
ЯЦКОЎ
адзначае 50-годдзе

14 мая
Жана Анатольеўна
ПАГУЛЯЕВА
адзначае 35-годдзе

Віншуем!

З Днём нараджэння!

У маі нарадзіліся:

2 - Міхаіл Мікалаевіч Фралоў
2 - Аляксей Святаслававіч Паршнёў
3 - Карына Сяргееўна Бірукова
5 - Уладзімір Пракопавіч Арцюшэнка
10 - Кацярына Захараўна Лужанкова
10 - Аляксандр Цімафеевіч Селюкоў
10 - Андрэй Яўгенавіч Палтаўцаў
11 - Ірына Збышкаўна Дудар
12 - Таццяна Дзмітрыеўна Макарэвіч
14 - Любоў Мікалаеўна Шастакова
15 - Міхаіл Лаўрэнавіч Ільёў
15 - Ева Сіманаўна Аляксеенка
23 - Дар'я Ўладзіміраўна Саўчына
25 - Віктар Іванавіч Рамашкевіч *(вул.Школьная)*
27 - Сяргей Міхайлавіч Жураўлёў
27 - Анатоль Аляксеевіч Булаўскі
30 - Міхаіл Спірыдонавіч Чулык

Рэлігійныя святы

6 - День Святого Георгия Победоносца
21 - День Иоанна Богослова
21 - католическое Вознесение Господне
22 - День Святого Николая
28 - Вознесение Господне
31 - католическая Пятидесятница (День Св. Духа)

Св. Николай Угодник

Дарога на Свяцілавічы

25 красавіка 2009 года ў жыцці нашай зямлячкі Марыі Мікалаеўны Фраловай пачаўся новы адлік -- яна пайшла замуж. Яе абраннік -- Аляксей Міхайлавіч Лыськоў з Бялыніцкага раёна. Ён працуе электрыкам у тамашніх раённых электрычных сетках. А пазнаёміліся нашы маладыя людзі ў вёсцы Свяцілавічы, што ў СПК "Калгас імя К.Заслонава", куды Марыя паехала працаваць эканамістам пасля заканчэння магілёўскага агралесатэхнічнага каледжа імя К.Арлоўскага. А як пазнаёміліся, так і прыйшлі да іх высокія пачуцці. І праз пэўны час, цёплым красавіцкім днём, па брылеўскіх вуліцах у бок бацькоўскай хаты Марыі пранёсся расквечаны вясельны картэж -- жаніх спяшаўся да сваёй абранніцы. І забраў Аляксей нашу Марыю, і павёз хоць і не ў далёкую, але ж чужую старонку. І дарога аб Брылёў да Свяцілавічаў пралягла напятай струной праз жыццё і лёс, адгукнуўшыся новым, невядомым гучаннем...

А мы жадаем гэтым прыгожым людзям кахання і згоды, веснавой сонечнасці і моцных падмуркаў іх агульнага сямейнага дома.

Шчасця вам, Марыя і Аляксей!

Мікола ЯЦКОЎ.

Фотаздымкі з сямейнага архіва Аляксея і Марыі Лыськовых.



Жаніх.



Што там -- наперадзе?..

Ля роднай брылеўскай хаты з бацькамі Мікалаем Васільевічам і Таццянай Яўгенаўнай.





З вайсковага палігона прыехаў павіншаваць сястру брат Міхаіл.



І як ён гэта зрабіў?

Іваноўы

Што такое шчасце? Пра гэта можна казаць бясконца, але словамі пра гэта сказаць амаль немагчыма. Бо ўся гэта ўзнёслая чалавечая гармонія знаходзіцца там, дзе жывуць нашы адчуванні і пачуцці. І калі побач ёсць той самы светлы выток з назвай “шчасце”, то наша сэрца абавязкова адклікаецца...

Менавіта такі непаўторны свет зыходзіць ад брылеўскай сям’і Івановых. Аляксандр Аляксандравіч і Вольга Нічыпараўна ў жыцці не вельмі шмаслоўныя. Але калі яны разам, то разумеюць адзін аднаго, як кажуць, *“с полуслова, с полувзгдяда”*. А іх сын Зміцер і дачка Вераніка ад самога дзяцінства маюць рэдкую магчымасць калыхацца на цёплых хвалях бацькоўскай прыязнасці і паразумення...

Відаць, шчасце і павінна быць такім -- нягучным, сціплым, не на паказ. І такім неабходным не толькі Івановым, але і ўсім нам, -- дзеля жыцця, дзеля будучыні нашай.

Мікола ЯЦКОЎ.

Фотаздымкі аўтара.

Аляксандр і Зміцер.

Вольга і Вераніка.

...Кожны год пахне хлебам ралля
На Русі, што празвалася Белай.

KAMUNIKAT.org

Радня

В.Аршынскі

Інтэрв'ю Т.Лусцянковай

У адной з сваіх нядаўніх публікацый "Брылеўскі летапіс" узгадваў пра тое, што вядомы магілёўскі тэлеаператар Вадзім Генадзьевіч Аршынскі па матчынай лініі паходзіць з нашых Брылёў і што ён вельмі хоча даведацца пра сваіх суродзічаў. Мы правялі сваё журналісцкае расследаванне і з дапамогай Тамары Васільеўны Лусцянковай высветлілі цікавыя акалічнасці гэтай справы.

Тамара Васільеўна паведаміла, што прадзеда В.Аршынскага звалі Ермалай. У яго былі сыны Ігнат, Іван, Міхаіл, Аўген і дачка Праскоўя. Можа хто быў і яшчэ з дзяцей, але сляды згубіліся.

Ігнат Ермалаевіч Мяшкоў -- дзед В.Аршынскага -- быў жанаты на Варвары Канстанцінаўне Жылінскай. Так што ў гэтым радаводзе да лініі Мяшковых дабаўляецца лінія Жылінскіх. Калі паглядзець па іншых дзецях Ермалая, то, напрыклад, Іван прыходзіцца дзедам Вользе Ягораўне Арцюшковай (Халмовай), Веры Дзмітрыеўне Лятка (Калячковай) і шмат каму яшчэ. Міхаіл -- дзед Раісы Іванаўны Чыкунскай (Мяшковай). Аўген -- дзед Тамары Васільеўны Лусцянковай (Мяшковай). А Праскоўя -- бабка Мікалая Іванавіча Раманава (якога ўсе мы ведаем па ласкавай мянушцы "Клос"). І ўсе гэтыя ўнукі, а таксама і астатнія з Ермалаевага кораня, пра якіх мы тут не ўзгадалі, з'яўляюцца між сабой траюраднымі братамі і сёстрамі. Так што Вадзім Аршынскі займеў ў Брылях вялікую радню.

Вядома ж, ён хваляваўся, калі пачуў усе гэтыя звесткі. І, прыехаўшы 6 мая ў Брылі па справах сваёй тэлекампаніі, выказаў пажаданне сустрэцца з сваёй сястрой Тамарай Лусцянковай. І пачаліся агульныя ўспаміны пра прадзеда і дзядоў, а потым уключылася тэлекамера -- і постаць Тамары Васільеўны на фоне роднай хаты трапіла ў перакрыжаванні тэлевізійнага рэпартажу...

Трэба ведаць свае вытокі і карані. Трэба, каб *памяць* была з намі.

Мікола ЯЦКОЎ.

Фотаздымкі аўтара. *6.05.2009 г.*

Квітнеюць маёвыя сады...

Літаратурная старонка

Чысты голас

Адкуль прыходзяць вершы? Невядома. І адбываецца гэта раптоўна -- у каго раней, у каго пазней. 11-гадовы брылеўскі хлопчык Святаслаў МЕЛЯШКОЎ адчуў гэты надыход, па яго словах, два месяцы таму -- і паклаліся вершаваныя радкі на старонкі звычайнага школьнага сшытка. І няхай там ёсць пэўныя недакладнасці ў тэхніцы вершаскладання, але ж старонкі тыя перапоўнены сонечнай непасрэднасцю і імкненнем па-свойму паглядзець на навакольны свет. І чыстым голасам распавесці ўсім нам пра тое, што хвалюе. А мы ўдзячны Святаславу за гэта і жадаем, каб нябесныя хвалі паэзіі як мага часцей люлялі яго.

У добры шлях!

Мікола ЯЦКОЎ,
член Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Святостав МЕЛЕШКОВ

Маме.

Мамочка любимая!
Ты моя красивая;
Характер твой такой
родной --
Как для тебя и мой.

Без мамы солнце не горит,
За мамой вся семья стоит.
Без мамы жить я не могу,
Я перед мамою в долгу.

Святаслаў Меляшкоў

Елена Алданова

* * *

Вновь в городе цветут каштаны,
И в скверриках шумят фонтаны --
Вновь в нашем городе весна...

Девчонкам стало не до сна,
Хотят наряды помоднее,
А песни -- чтоб повеселее;
Хотят с мальчишками дружить,
Улыбки им хотят дарить;
Чтоб жить,
сиять,
не унывать,
Цветы в награду получать.

* * *

Шорох гальки, шум прибоя.
Крики чаек над волною.
В мыслях нас, конечно, двое.
Только нет тебя со мною...

* * *

Был месяц май –
такой обыкновенный.
Что каждую весну приходит к нам
на землю.

Сверкало солнце,
Тишь да благодать,
Идиллия и мир, --
О чём ещё мечтать?..

Откуда ветер, тучи те откуда?
Кто сделать мог такое злое чудо?
Вмиг потемнело и затихло всё кругом…
Вдруг молния!
И грянул майский гром!

...Прошли мгновенья.
Туч тех не видать,
И снова солнце,
Тишь да благо-
дать!..

Вот так и в жизни,
Как в природе, --
То гром гремит,
То солнышко

Белорусская НИВА

14.05.2009 г.

Вядомы беларускі паэт Сяргей ЗАКОННІКАЎ распавядае пра свой веснавы настрой:

Бярозавы гай

Прыцягненне красы і святла
Чалавека да скону пільнуе.
Сцежка зноў да бяроз прывяла --
Прывітаць цысціню незямную.
Звонкі ўзлёт санцавітых ствалоў,
Лёгкі кужаль смяшлівай лістоты...
Ты ідзеш і душою без слоў
Просіш лёс незгаворлівы ўпотай,
Каб заўжды прад вачыма плылі,
Хвалявалі спрадвечнай мілосцю
Завушніцы на тонкай галлі
І радзімкі на белай бяросце.

Народная газета

24.04.2009 г.

КАСМАНАЎТЫ ПРЫЗЯМЛІЛІСЯ Ў МІНСКУ

Касманаўт Аляксей ЛЯВОНАЎ прыехаў у Мінск, каб адкрыць сваю персанальную выставу ў Нацыянальным мастацкім музеі. Валянціна ЦЕРАШКОВА, першая

Аляксей Лявонаў і Валянціна Церашкова

жанчына - касманаўт, суправаджала свайго даўняга сябра таксама невыпадкова: тут радзіма яе бацькоў.

А.Лявонаў малюе з тых часаў, калі пра неба яшчэ і не мроіў. Талент прачнуўся ў дзяцінстве, хаця маленства было цяжкае -- на мяжы выжывання.

-- У 1957 годзе рэпрэсіравалі майго бацьку. Маці з васьмю дзецьмі была выкінута на вуліцу, -- раскрыў невядомыя старонкі свайго жыцця Аляксей Архіпавіч. -- *Уратаваў нас 23-гадовы муж маёй сястры Антон Хадановіч, які прыехаў у Кемерава з Магілёва. Антон Платонавіч, дачуўшыся пра бяду, адразу вырашыў: "Хай маці з дзецьмі пераязджае да нас!" Так мы і туліліся -- 11 чалавек на 16 метрах барака. Праз два гады бацьку вызвалілі, і ён атрымаў побач два пакоі па 18 метраў. Але калі б не беларускі муж сястры, які ўратаваў нас ад голаду і холаду, можа, я цяпер пра гэта не расказваў бы...*

Валянціна Церашкова спецыяльна адзначыла, што мае беларускія карані:

-- Мая мама родам з вёскі Ерамееўшчына цяперашняга Дубровенскага раёна, а тата -- з-пад Магілёва. Бацькі выехалі ў Цэнтральную Расію ў пачатку XX стагоддзя, бо дома не маглі пракарміцца. Усе мае бабулі гаварылі па-беларуску, спявалі беларускія песні. З мяне самой у Яраслаўлі пасмейваліся, калі замест "открой дверь" ґаварыла "адчыні дзверы".

Брылеўская бібліятэка інфармуе...

ЗВЯЗДА

24.04.2009 г.

ХЛЕБ

Хлеб заўсёды сімвалізаваў дабрабыт, прыбытак, багацце. У народнай культуры хлеб успрымаецца як вялікі боскі дар, які патрабуе паважлівага стаўлення і пашаны. Праца хлебароба заўсёды была самай цяжкай і адказнай у жыцці чалавека. Адсюль з пакалення ў пакаленне, ад дзеда да ўнука перадавалася беражлівае стаўленне да хлеба, выпрацоўваўся шэраг правілаў і перасцярог:

- Выкідваць хлеб заўсёды лічылася недаравальным. Калі хлеб немагчыма ўжываць у ежу, аддайце яго птушкам.
- *"Каб быць шчаслівым і ўдалым, на пачатку і на заканчэнні абеду з'еш крыху хлеба з соллю".*
- Лічылася, што калі пасля прыняцця ежы на стале пакінуць кавалачкі няз'едзенага хлеба, вы страціце сваё здароўе.
- Той, хто з'есць крыху цвілога хлеба, хутка навучыцца плаваць і не будзе пужацца навальніцы.
- Каб сям'ю не спасціг голад, няўрод ці іншыя страты, строга сачылі за тым, каб хлебныя крошкі не падалі са стала на падлогу.
- Жанчыну, якая рабіла цеста на хлеб, трэба было абавязкова вітаць добрымі пажаданнямі.
- Калі хлеб "саджалі" ў печ, гаспадыня падымала спадніцу і прасіла: *"Падымайся, хлеб, вышэй і вышэй!"*

Акрамя таго прыкмячалі:

- Калі за абедам хлеб выпадае з рук -- чакай госця.
- Калі адзін бохан хлеба вымуць з печы і парэжуць раней за астатнія, то тыя, што засталіся ў печы, будуць нясмачнымі і непрыдатнымі для ўжывання ў ежу.
- Калі хлеб у печы распаўся на дзве часткі, хтосьці пакіне сям'ю.

УКРАЛІ САД

55 саджанцаў яблынь зніклі з саду КСУП "Брылёва", што пад Гомелем. Невядомыя ноччу праніклі ў пасадкі і выкралі дрэвы, якія каштуюць каля 420 тысяч рублёў.

Аргументы и факты

№ 17, 2009 г.

ЯЙЦА не только не повышают холестерин, но ещё снижают давление и препятствуют развитию гипертонии. Полезнее всего яичница. Это выяснили канадские учёные, проведя очень серьёзные исследования, в которых они сравнили, как могут влиять на давление яйца, сваренные вкрутую, и глазунья. Оказывается, метод готовки сказывается на полезности яиц.

Прозвішча падпісчыка

Імгненні

Распачаўся рамонт даху на будынку Брылеўскай школы-сада. *7 мая 2009 г.*

Ігледзячы на прахалодную вясну, на палетках дружна зазелянелі жытнёвыя ўсходы. *8 мая 2009 г.*

Ястомныя пчолы пачалі сваю руплівую працу на квітнеючых брылеўскіх абсягах. *12 красавіка 2009 г.*

Гароджа маста праз Рудэю сіламі дарожнай службы атрымала новую ярка-чырвоную веснавую афарбоўку. *8 мая 2009 г.*

Усё часцей на змену адной конскай сіле прыходзяць вось такія механізаваныя памочнікі. *8 мая 2009 г.*

Вось такія амаль рукатворныя вянкі адпраўляе наша Рудэя ў дальнюю дарогу... *27 красавіка 2009 г.*

Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь для жыхароў Брылеўскага рэгіёна і наваколля.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 100 асобнікаў.

Адрас для карэспандэнцыі:
213107 Магілёўскі раён п/а Брылі
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com
© “Брылеўскі летапіс”, 2009

Заснавальнік і рэдактар
Мікола ЯЦКОЎ